Выйсці за межы праграмы і наблізіць беларускую мову да вучняў старэйшага ўзросту – справа няпростая. Тым не менш я паспрабавала гэта зрабіць з вучнямі 9 “В”класа. Яшчэ ў 8 класе дзеці пісалі пераказ паводле тэлеперадачы “Размаўляем па-беларуску”. Фармат праграмы зацікавіў дзяцей, і яны выказалі прапанову правесці такую ж гульню ў класе. Сабралі дзве каманды – хлапчукоў і дзяўчынак – і арганізавалі конкурсы з выкарыстаннем тэлевізара і падрыхтаваных слайдаў. Вучні разгадвалі слайд-пытанні, тлумачылі сэнс фразеалагізмаў, вызначалі аўтараў вершаў, музыкальных кампазіцый. Лёгка знаходзіліся адказы на крыжаванкі, а вось беларускія песні і выканаўцы выклікалі цяжкасці ў дзяцей. Прыемна было, што ўсё ж некаторыя вучні ведаюць нашых беларускіх зорак: Алену Ланскую, “Песняроў” і “Сяброў”. У канцы гульні ўсе ўдзельнікі атрымалі салодкія прызы і засталіся задаволеныя заняткамі.

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Кайданава В.В.





